**Успомніце.** Назавіце беларускія народныя казкі, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках літаратурнага чытання раней. Чаму яны называюцца народнымі? З якіх структурных частак складаецца беларуская народная казка? Для чаго людзі прыдумалі казкі? Якая іх роля ў жыцці чалавека?

**Свяця́чы** — *тут*: той, які ярка свеціць.





## Песня і казка

*(Скарочана)*

*Янка Купала*

Песня і казка
Ходзяць у пары,
Сеюць па свеце
Дзівы і чары,

Будзяць спрасоння
Думкі дзіцячы,
Як той уранні
Промень свяця́чы.

Песня і казка,
Як у крышталі,
Свету пакажуць
Тайныя далі.

Песня і казка
Ў райскіх праявах

Шчасце збудуюць
З кветак яскравых.

Сэрца атуляць
Вечнаю ласкай…
Слухай жа, сэрца,
Песні і казкі.



1. Чаму Янка Купала апісвае ў вершы два віды народнага мастацтва — песню і казку?
2. Якую ролю, на думку паэта, адыгрываюць у жыцці чалавека песня і казка?
3. Знайдзіце ў вершы і прачытайце ўжытыя ў пераносным значэнні словы, з дапамогай якіх аўтар апавядае пра песню і казку.
4. З чым параўноўвае аўтар у вершы песню і казку?
5. Да чыйго сэрца звяртаецца паэт у апошніх радках? Патлумачце.
6. Прывядзіце прыклады са свайго вопыту, калі беларускія песні і казкі асабліва ўразілі вас.

**Кру́мкаць** — *тут*: ква́каць, як жабы.
**Сло́дыч** — прыемнае адчуванне, асалода.
**По́шчак** — водгук, рэха.
**Па́ншчына** — дармавая прымусовая праца сялян на пана.
**Ціву́н** — наглядчык за працай сялян у памешчыка ў часы прыгону; прыганяты.
**Нябо́жчык** — мёртвы чалавек.
**Хоць гаць гаці́** — вельмі многа.
**Пе́кла** — месца, дзе церпяць вечныя пакуты душы памерлых грэшнікаў.



Правообладатель Академия образования